Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (124), 2021

*УДК 821.161.3 «19» 09+929 [К. Чорны]*

# Чалавеказнаўчы патэнцыял твораў Кузьмы Чорнага

А.М. Мельнікава

У артыкуле асэнсоўваецца гуманістычная скіраванасць твораў Кузьмы Чорнага. Паказваецца, што вызначальная інтэнцыя пісьменніка – сцвярджэнне ідэалаў чалавечнасці, самакаштоўнасці і вартасці асобы. Праблема чалавека ў творах Кузьмы Чорнага асэнсавана ў кантэксце сацыяльных змен і крызісу маральных і светапоглядных каштоўнасцей, якія перажывала грамадства ў першай палове XX ст. Кузьма Чорны паслядоўна сцвярджаў гуманістычныя прыярытэты, адстойваў ідэю чалавека як непаўторнай індывідуальнасці. Пэўныя погляды на чалавека прадвызначылі спецыфіку іх мастацкага ўвасаблення на ідэйна-тэматычным і стылёвым узроўнях.
**Ключавыя словы:** канцэпцыя чалавека, асоба, этыка, філасофскае гучанне, інтэлектуалізм, паэтыка, інтэнцыя.

The article comprehends the humanistic orientation of Kuzma Chorny's works. It is indicated that the defining intention of the writer is the affirmation of the ideals of humanity, self-worth and dignity of the individual. The problem of man in the Kuzma Chorny's works is understood in the context of social changes and the crisis of moral and ideological values that society was experiencing. Kuzma Chorny consistently affirmed humanistic priorities and defended the idea of a person as a unique individual. Certain views on a person predetermined the specifics of their artistic implementation on the ideological, thematic and stylistic levels.
**Keywords:** Human concept, personality, ethics, philosophical sound, intellectualism, poetics, intention.

Кузьма Чорны – пісьменнік, які ў часы прагматызму, глабальных грамадскіх катакліказмаў, бясконцых войнаў, змены сацыяльнага ладу, у часы панавання ідэй класавай нянавісці і варожасці сцвярджаў ідэалы чалавечнасці, міласэрнасці, дабрыні. Кузьма Чорны прынцыпова не мог пагадзіцца з тым, што чалавек – толькі шрубчык у дзяржаўным механізме (сумнавядомыя словы Сталіна). Гэтаму падыходу беларускі пісьменнік супрацьпаставіў іншае: «Чалавек – гэта цэлы свет». (Часам у навуковай літаратуры можна сустрэць, што агучаныя словы – цытата з Ф. Дастаеўскага, але раней за Ф. Дастаеўскага аналагічныя словы прагучалі ў Г. Гейне: «Кожны чалавек – гэта свет, які нараджаецца разам з ім і разам з ім памірае…»).

Канцэпцыя чалавека дазваляе акрэсліць і асэнсаваць этычныя прыярытэты нацыянальнага прыгожага пісьменства, прааналізаваць спецыфіку мастацкага мыслення аўтара, а таксама даследаваць духоўную, эстэтычную адметнасць пэўнай культурна-гістарычнай эпохі. Адны этычныя ўстаноўкі характэрны для нацыянальнай літаратуры на ўсім працягу яе развіцця, з'яўляюцца канстантнымі, другія актуалізуюцца ў асобныя перыяды развіцця грамадства і мастацтва слова.

Цэласнае асэнсаванне канцэпцыі чалавека пэўнага літаратуранага этапу дазваляе прасачыць філасофска-этычную трансафармацыю свядомасці чалавека першай паловы XX ст., эпохі сацыяльных катаклізмаў і пераўтварэнняў.

Ужо ў ранні перыяд творчасці, у 1920-х гг., Кузьма Чорны заяўляе пра жаданне спазнаць самыя глыбінныя рухі чалавечай псіхалогіі і свядомасці: «Ды яшчэ было жаданне непрыкметна душой увайсці ва ўсе таямніцы, што ў жывых істотах захаваны, увайсці ласкава і ціха, з чыстымі думкамі і адчуваннямі…» [1, с. 299–300]. З другога боку, пісьменнік усведамляе немагчымасць канчатковага разумення і вытлумачэння чалавека: «А чалавек – гэта ж свет, адна істота – неабхватны прастор, і разглядай яго, калі ўмееш» [1, с. 302]. Усё, што тычыцца чалавека, мае для Кузьмы Чорнага глыбокі сэнс і значэнне: «І ўсё, самае нават малое, праходзячы праз людскія пачуцці, поўна было вялікага сэнсу» [1, с. 340].

Апавяданні Кузьмы Чорнага са зборнікаў «Пачуцці», «Хвоі гавораць» сталі этапнымі для беларускай прозы як у напрамку ўзмацнення яе філасофскага, інтэлектуальнага гучання,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

так і па глыбіні псіхалагічнага аналізу. Прадметам асэнсавання пісьменніка выступаюць так званыя вечныя праблемы: сутнасць чалавека, узаемаадносіны паміж людзьмі і інш. Што сведчыла пра сталенне беларускай мастацкай думкі, пра глыбіню, значнасць пошукаў Кузьмы Чорнага.

У апавяданні «Вечар» Кузьма Чорны сцвярджае ідэю пра вартасць і самакаштоўнасць чалавека. Празаік перакананы, што чалавек здольны пазбавіцца ўсяго, што «псуе вялікае хараство чалавека» [1, с. 299]. Чалавека Кузьма Чорны ўспрымае як істоту гарманічную, для якой хаос непрымальны: «Гэта была ненармальнасць, быў хаос, і чалавек, заўсёды праціўны яму, шукаў гармоніі» [1, с. 318]. Станаўленню падобных поглядаў спрыяў сам час, з яго катаклізмамі, пераўтварэннямі, якія разбуралі цэльнасць асобы.

Этапным для Кузьмы Чорнага і ўсёй беларускай літаратуры стаў раман «Сястра». Мы ацэньваем гэты твор як першы філасофскі раман у нацыянальным прыгожым пісьменстве [2, с. 43–44]. У рамане адлюстраваны грамадскія працэсы, дыскусіі, характэрныя для 1920-х гг., і перш за ўсё – праблема чалавека і стаўлення да яго. Героі «Сястры» выступаюць як носьбіты пэўных поглядаў на чалавека. Сістэма персанажаў у творы выбудоўваецца на аснове бінарных апазіцый. Героі рамана ўвесь час разважаюць, спрачаюцца паміж сабой адносна сутнасці чалавека, стаўлення да яго. Такім чынам, у творы прысутнічае момант сутыкнення, супастаўлення поглядаў, «дыялог паміж свядомасцю герояў», згодна з М. Бахціным.

Галоўны герой рамана Ваця Браніславец выступае носьбітам ідэі пра тое, што чалавек – гэта мэта, а не сродак. Герой паслядоўна і настойліва адмаўляе любы прымус, гвалт над асобай, якую б форму гэты гвалт ні прымаў і якімі б словамі і мэтамі не апраўдваўся. Браніславец сцвярджае права кожнага чалавека на ўласную думку. Антон Адамовіч ахарактарызаваў героя як «самую жыццёсцвярджальную постаць рамана»: «Ён прыроджаны апазіцыянер, чые мэты падобныя да мэтаў Ул. Дубоўкі, якога ён сімвалізуе. Гэта прагрэс, рух да ўласных мэт, не навязаных афіцыйнай лініяй» [3, с. 90].

Кузьма Чорны лічыў, што чалавек мае права на свабоду думкі, учынку, выбару. На выклікі часу айчынная літаратура адказала паказам чалавека, які мае мужнасць адстойваць права на асабістую думку.

Пісьменнік акцэнтуе ўвагу на важнасці захавання ўнутранага духоўнага рэсурсу, што сведчыць пра глыбіню этыка-філасофскага падтэксту яго твораў. Браніславец перакананы, што людзям нельга нешта навязваць насуперак іх волі, пачуццям. Тым больш недапушчальна жорсткасць, якая прыкрываецца высокімі мэтамі. Такім чынам, важным семантыка-стылістычным элементам рамана «Сястра» Кузьмы Чорнага з’яўляецца канцэпт свабоды выбару.

Істотны фактарам рэалізацыі канцэпцыі чалавека выступае праблема аўтара, выяўленне аўтарскай пазіцыі, што дазваляе не толькі асэнсаваць канцэпцыю пісьменніка ўвогуле, але і высветліць яго стаўленне да рэчаіснасці. У 1920-я гг. на змену прыярытэту агульначалавечага, заснаванага на хрысціянскіх пастулатах, выступае класавы падыход, ідэя пабудовы светлай будучыні, сацыяльнай справядлівасці нават коштам шматлікіх чалавечых ахвяр.

Кузьма Чорны занепакоены тым, што тыя змены, якія былі абвешчаны ў імя чалавека, абарочваюцца супраць яго, а сам чалавек пачаў успрымацца як сродак: «Ты з ім кланяешся дынаміцы, паставіўшы яе мэтаю, а ты пастаў сябе, усіх, мэтаю і застаў яе пакланіцца табе, пакінуўшы яе як неабходнасць у жыцці...» [4, с. 47]. Пісьменнік адстойвае ідэю чалавека як непаўторнай індывідуальнасці, апелюе да гуманных этычных інтэнцый.

Кузьма Чорны не мог пагадзіцца з тым, што адзін чалавек мае ўладу над другім, што зневажаецца чалавечая годнасць. Гэта праблема – адна з галоўных у рамане «Сястра»: «Шалёна спрачаліся мы тут наконт урачыстасці чалавека над чалавекам» [4, с. 170]. Пісьменнік выступае за вызваленне чалавека ад стану прыніжанасці, пакоры, падпарадкаванасці. Да гэтай ідэі ён будзе зяртацца на працягу ўсёй творчасці. Так, у рамане «Ідзі, ідзі» прагучала: «Вы думаеце, што той новы чалавек, пра якога вы мне тады чыталі ў сваіх вершах, будзе толькі таму новы, што будзе абуты, негалодны, адзеты? Ну, адным словам, выратуецца з сацыяльных бядот, а сам, які быў, гэтакі і застанецца?.. Поўны новы чалавек пачнецца тады, калі з яго будзе вытраўлены апошні цень ад пачуцця ўсялякага акафіста ў дачыненні да каго і да чаго б там ні было...» [4, с. 182].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Апанентам Браніслаўца ў рамане «Сястра» выступае Абрам Ватасон. Абрам перакананы, што чалавекам неабходна «кіраваць»: «Над гэтаю сілаю павінна быць сіла чужое волі» [4, с. 175], «...агульнасць застаўляе падначаліцца кожнае нутро» [4, с. 90]. Больш за тое, ён упэўнены ў непазбежнасці і правамернасці нават чалавечых ахвяр: «Лес заўсёды расце для таго, каб яго сеч. У гэтым вечнае абнаўленне. А якім ты спосабам яго ні сячы, усё роўна не можаш ты яго сеч так, каб не было трэсак...» [4, с. 15].

Абрам – прыхільнік жорсткай лініі, «жалезнай рукі», што Кузьма Чорны прыняць не мог. Празаік выдатна ўсведамляў небяспеку, што сыходзіць ад такіх «цвёрдых», непахісных у сваёй рашучасці асобаў, якія маюць уладу распараджацца чужымі лёсамі.

Як бачым, Кузьма Чорны сцвярджаў каштоўнасць чалавека не толькі ў філасофскім, светапоглядным, псіхалагічным аспектах. Ён выступаў і супраць тых адносін да чалавека, што ўсталёўваліся ў грамадстве і якія ператваралі чалавека ў сродак, пазбаўлялі свабоды самавыяўлення. Кузьма Чорны быў перакананы, што людзям нельга навязваць нешта насуперак іх волі, пачуццям. Тым больш недапушчальная жорсткасць, якая апраўдваецца высокімі ідэямі: «Шыльды для таго і існуюць на свеце, каб засляпляць сэнс саміх рэчаў» [4, с. 14], – гаворыць «ідэолаг» падобнай палітыкі, былы камісар, «жалезны» Абрам Ватасон.

Пісьменнік адлюстроўвае працэс дэфармацыі такіх традыцыйных маральных парадыгмаў, як Дабро і Зло, што ў далейшым прывядзе да масавых рэпрэсій.

Насуперак тэндэнцыі на падаўленне асобы наша літаратура дала свой адказ – сцвярджэнне чалавечнасці, спачування, зварот да гуманных інтэнцый асобы.

Можна нагадаць, што і інтуітывізм, адчувальны ў творах Кузьмы Чорнага гэтага часу, – своеасаблівае адмаўленне пазітывісцкага дагматызму, зададзенасці, утылітарнага погляду на чалавека і грамадства.

Намаганні нашых пісьменнікаў сцвердзіць суверэннасць асобы, псіхолага-антрапалагічны аспект твораў Кузьмы Чорнага, М. Гарэцкага, Міхася Зарэцкага, Лукаша Калюгі выступаюць паказчыкам аўтанамізацыі беларускай літаратуры.

Кузьма Чорны паслядоўна выступаў абаронцам чалавечай годнасці. Характэрна, што афіцыйная крытыка 1920-х гадоў пабачыла ў падобных інтэнцыях выразную небяспеку. Так, Т. Глыбоцкі абвінавачваў пісьменніка ў пошуках «звышчалавека»: «Гэта лакалізацыя “чалавечнасці” ў паасобным індывідууме пры адначасовым наданні гэтаму індывідууму нейкай асаблівай сілы – ці не нагадвае нам шуканняў нейкага звышчалавека?» [5, с. 221], а М. Піятуховіч – у ідэалізме: «Для К. Чорнага чалавек – асобы складаны мікракосм, жыццё якога развіваецца па сваіх унутраных законах, незалежных ад законаў вакольнага грамадства. Чыста ідэалістычным аршынам пісьменнік вымервае глыбіню і напружанасць “пачуццяў”, бо ў гэтай глыбіні і напружанасці заключаны для яго адзіны крытэрый вартасці чалавека» [6, с. 58]. У той час падобныя абвінавачванні гучалі досыць пагрозліва.

У ракурсе сучасных літаратуразнаўчых падыходаў асэнсаванне канцэпцыі чалавека прадугледжвае аналіз паэтыкі твора, заканамернасцей мастацкага мыслення аўтара. Характэрнай рэакцыяй на той прагматызм, утылітарны погляд на чалавека, што пачаў набіраць сілу ў грамадстве, быў зварот Кузьмы Чорнага да перадачы складанай гамы чалавечых настрояў, адчуванняў, што абумовіла спецыфіку стылёвых, наратыўных стратэгій аўтара.

Палемічным у адносінах да павярхоўна-спрошчанага разумення чалавека, успрымання яго толькі як выканаўцы «чужой волі» выступае сам прынцып пабудовы рамана «Сястра» – падрабязны аналіз думак, паводзін, учынкаў персанажаў, паглыбленне ў іх унутраны свет, што ўжо само па сабе сведчыць аб значнасці, каштоўнасці асобы чалавека.

Кузьма Чорны сцвярджаў прынцыповую немагчымасць канчатковага вытлумачэння і разумення чалавека, яго нівеліроўкі: «То гэта ты думкі можаш растлумачыць, а пачуцці хіба заўсёды можаш?…» [1, с. 306].

У творах 1920-х гг. Кузьма Чорны падае разгорнутую панараму ўнутранага жыцця асобы, скрупулёзна апісвае найтанчэйшыя рухі ў псіхалогіі і свядомасці герояў, перадае працэс нараджэння думак, пачуццяў, настрояў, даследуе механізмы работы свядомасці чалавека (раман «Сястра», апавяданні са зборнікаў «Пачуцці», «Хвоі гавораць»).

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

Пісьменнік будуе складаныя псіхалагічныя комплексы, дзе цесна ўзаемазвязаны мінулае і сучаснае, неўсвядомленыя адчуванні і выразна акрэсленыя пачуцці.

У творах 1940-х гг. Кузьма Чорны пакутліва разважае над тым, адкуль столькі гора, няшчасцяў, чаму людзі здольныя на забойствы, на нянавісць, ці засталося нешта чалавечае ў чалавеку: «Ці ты верыш, што чалавек не вытрымае, каб вечна быць зверам? Вырві ты з чалавека сэрца і ўстаў на яго месца звярынае, дык у чалавечых грудзях і звярынае сэрца стане чалавечым» [7, с. 116].

У рамане «Млечны Шлях», напісанага падчас выпрабаванняў Другой сусветнай вайны, Кузьма Чорны спрабуе зразумець, наколькі чалавек з'яўляецца разумнай істотай, колькі сапраўды чалавечага ў чалавеку. Нягледзячы на ўсе жахі, выпрабаванні, якія даводзіцца пераадольваць яго героям, пісьменнік перакананы: «Як свет стаіць, то яшчэ не было вядома, каб на нянавісці вырасла шчасце. А радасць на чужой бядзе» [7, с. 124–125].

Такім чынам, у часы жорсткага класавага і сацыяльнага супрацьстаяння, у часы катаклізмаў і войнаў Кузьма Чорны імкнуўся сцвердзіць ідэалы чалавечнасці, міласэрнасці, што сведчыць пра магутны маральны патэнцыял як твораў самога пісьменніка, так і беларускай літаратуры ўвогуле.

**Літаратура**

1. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны. – Мінск : Маст. літ., 1972. – Т. 1 : Апавяданні 1923–1927 гг. – 544 с.

2. Мельнікава, А. М. Паэтыка твораў Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава ; навук. рэд. І. Ф. Штэйнер. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2008. – 186 с.

3. Adamovic, A. Oppozition to Sovitization in Belorussian literature (1917–1957) / A. Adamovic. – New York : Scarecrow press, 1958 – 204 p.

4. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 3 : Раманы «Сястра», «Зямля». – 533 с.

5. Глыбоцкі, Т. Пад шыльдай пралетарскай літаратуры / Т. Глыбоцкі // Полымя. – 1927. – № 4. – С. 219–229.

6. Піятуховіч, М. З кнігапіса. З рэцэнзіі на «Сцены» Кузьмы Чорнага / М. Піятуховіч // Маладняк. – 1927. – № 5. – С. 93.

7. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 6 : Раманы «Пошукі будучыні», «Млечны шлях», «Вялікі дзень», аповесць «Скіп'еўскі лес». – 520 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 19.06.2020

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ